# ПРЫГОДЫ І ПАДАРОЖЖЫ ПАВОДЛЕ РАІСЫ БАРАВІКОВАЙ (НА МАТЭРЫЯЛЕ АПОВЕСЦЕЙ ПРА «ПАЖАРНІКА»)

***Ю. С. Колбун***

**БДПУ (Мінск)**

***Навук. кіраўн. – І. М. Гоўзіч, канд. філалаг. навук, дац.***

**Анатацыя.** У артыкуле вызначаецца адметнасць фантастычнага жанру Раісы Баравіковай, разглядаецца спецыфіка аповесцей пісьменніцы пра міжпланетныя падарожжы і прыгоды.

**Ключавыя словы:** фантастыка; прыгоды; падарожжы; дзіцячая літаратура.

Беларуская дзіцячая літаратура Раісы Баравіковай – гэта загадкавая чароўная планета, якую насяляюць незвычайныя персанажы: бульбінка Адрэта, Пан Павучыдла, мамурыкі, міжпланетны пажарнік і інш. Як звярнулася Р. Баравікова да падобнага казачнага свету, менавіта адказ на гэтае пытанне мы паспрабуем высветліць і адлюстраваць у нашым артыкуле. Эпіграфам, ключом-разгадкай мы возьмем словы Максіма Танка

Дрэвы паміраюць,
Калі перастаюць пазнаваць
Змены года
І не адгукаюцца рэхам;
Чалавек – калі страчвае здольнасць
Здзіўляцца і захапляцца
Жыццём [3, с. 301].

Сапраўды, чалавек памірае, калі страчвае здольнасць здзіўляцца і захапляцца жыццём. Гэта страта адбываецца, калі чалавек перастае падарожнічаць. І, безумоўна, ён памірае не фізічна, а душэўна. «Жывым», сапраўдным можна лічыць толькі чалавека з актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Гэта чалавек, які верыць, што яму ўсё па сілах, што недасягальнага няма. Ён павінен імкнуцца да пазнання свету і не сядзець на месцы! Падчас падарожжа адбываюцца знаёмствы з прыгожымі мясцінамі, пазнанне і назапашванне чагосьці новага і незвычайнага.

Так і Р. Баравікова ў сваёй творчасці заўсёды імкнецца да новага, кліча чытачоў у захапляльныя вандроўкі не толькі па розных планетах, але і розных часавых вымярэннях. Яшчэ ў 1990 годзе выйшла яе кніга казак і апавяданняў для дзяцей «Галенчыны «Я», альбо Планета Цікаўных Хлопчыкаў», пазней з’явіўся цыкл фантастычных гісторый «З казак старога астранаўта» і кніга «Казкі астранаўта»… І нарэшце, гісторыі пра Мамурыка.

Галоўным героем казкі з’яўляецца Мамурык, імя якому дадзена па месцы жыхарства: планеты Мамурыі, дзе заўсёды жывуць мамуры. Р. Баравікова стварае вобраз Мамурыка – сапраўднага касманаўта, але робіць гэта ў цікавай займальнай форме. Міжпланетным Пажарнікам яго клічуць за асноўны занятак: калі падчас зоркападу на Зямлю ляцяць зоркі, Мамурык ловіць іх сачком, каб «*нідзе, ні на адной планеце, куды можа ўпасці непаслухмяная зорка, ні ўзнікла пажару*» [1, с. 98]. Аповесць Р. Баравіковай насычана і іншымі незвычайнымі з цікавымі імёнамі: Казяўка, крот Бутуз, Вялікі Мамур, Брыся і крот, якога называюць Сівой Поўсцю.

Аўтар прапануе сваім чытачам тры гісторыі пра міжпланетнага Пажарніка: у першай ён ўпершыню наведвае зямлю і выратоўвае планету ад крата Бутуза, у другой яшчэ раз наведае сяброў, а ў трэцяй становіцца галоўным аранжарэйшчыкам Мармурыі…

Цікава даведацца, што сама пісьменніца хоча сказаць пра свой твор. «Казачныя аповесці...» – гэта не толькі падарунак, але яшчэ і спроба зламаць некаторыя стэрэатыпы. «Гераіні маёй кнігі лятучыя мышкі Брыся і Нюня – вельмі сімпатычныя істоты. Яны і на самай справе мілыя і карысныя. Я паспрабавала пераламаць распаўсюджанае перакананне, што рукакрылыя – гэта героі толькі злых казак. Вельмі важна, каб дзеці ставіліся да гэтых жывёл дружалюбна, бо ў Брэсце селяцца вялікія калоніі кажаноў» [2], – лічыць аўтар. І сапраўды, Р. Баравікова хоча выхаваць у дзяцей добрыя адносіны да жывёл і ўсяго жывога на планеце.

Казкі Р. Баравіковай добрыя, жыццесцвярджальныя, аптымістычныя. У цікавай, займальнай форме яна даводзіць: як бы ні скláліся абставіны, ніколі не трэба адчайвацца: вяслуй да канца, узбірайся на самую высокую вежу і падарожнічай, адкрывай для сябе новыя краіны і загадкавыя планеты!

## *Літаратура*


1. Баравікова, Р. Казачныя аповесці пра міжпланетнага пажарніка і іншых мамурыкаў / Р. Баравікова. – Мінск : Маст. літ., 2010. – 144 с.
2. Сидорук, Ж. В Бресте Остромечево зафиксированы контакты с мамыриками / Ж. Сидорук [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.b-g.by/culture/6080/. – Дата доступа: 29.05.2018.
3. Танк, М. Мне пару крыл дало юнацтва… : выбр. лірыка / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 479 с.